Источник: "Краязнаўчая газета" - 2013-07-11

# Лёс адной Біблії

Ці ведаеце вы, што цяпер прачытаць знакамітую Брэсцкую Біблію зможа любы ахвочы? Гэта стала магчымым пасля з'яўлення яе электроннага выдання, прэзентацыя якога адбылася 18 чэрвеня ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі.

Удзельнікі імпрэзы расказвалі пра тое, што ў кніг, як і ў людзей, свае лёсы. Лёс Брэсцкай Біблії склаўся не вельмі проста. Яна была выдадзеная ў 1563 годзе на замову магната Мікалая Радзівіла Чорнага, які выдаткаваў на гэта нямала сродкаў. Сыны Радзівіла прынялі каталіцтва і прыклалі шмат намаганняў, каб знішчыць створанае іх бацькам выданне Біблії. Як лічаць даследчыкі, да нашага часу захавалася каля сарака яе асобнікаў; паводле іншых падлікаў, іх можа быць болей – каля сямідзесяці. Тым не менш, Брэсцкая Біблія сапраўды з'яўляецца бібліяграфічнай рэдкасцю. Экзэмпляры гэтага выдання знаходзяцца ў бібліятэках Літвы, Польшчы, Расіі ды іншых краінаў. Адзіны ў Беларусі асобнік Брэсцкай Біблії захоўваецца акурат у навуковай бібліятэцы нашай акадэміі навук. Гэты каштоўны падарунак быў зроблены ёй супрацоўнікамі Бібліятэкі імя Урублеўскіх Літоўскай Акадэміі навук у 1975 годзе, калі ЦНБ адзначала 50-годдзе.



Н. Бярозкіна



Дырэктар Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Наталля Бярозкіна распавяла наведнікам імпрэзы пра тое, як узнікла ідэя стварыць лічбавую копію Брэсцкай Біблії і тым самым зрабіць яе даступнай для вывучэння. Праект ажыццёўлены з дапамогаю супрацоўнікаў бібліятэкі імя Урублеўскіх, а таксама пры фінансавай падтрымцы ААТ «Белаграпрамбанк» – менавіта так і з'явілася электронная версія кнігі пад назвай «Брэсцкая Біблія – да 450-годдзя выдання».

Як расказала слухачам Алена Цітавец, загадчыца сектара кнігазнаўства аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў, якраз да прэзентацыі электроннага выдання супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі выстаўку «Брэсцкая Біблія – шэдэўр кнігадрукавання XVI стагоддзя». Асобны яе раздзел прысвечаны фундатару выдання Мікалаю Радзівілу Чорнаму.

Насамрэч, як 450 гадоў таму выданне Брэсцкай Біблії стала значнай падзеяй у культурным жыцці Вялікага Княства Літоўскага, так і стварэнне электроннай версіі кнігі для сучаснай Беларусі – падзея зусім не шараговая. Прынамсі, яшчэ адна культурная каштоўнасць стала не проста адзінкай у бібліятэчных фондах, а здабыткам усяго грамадства.

**Ніна КАЗЛЕНЯ**
**Фота аўтара**

Ніна Казленя. Лёс адной Біблії